# Васілю ТКАЧОВУ – 70!




*Віншуем з 70-годдзем добрага сябра «Вожыка», празаіка і драматурга Васіля Ткачова. Яго можна лічыць самым навагоднім пісьменнікам, бо нарадзіўся ён 1 студзеня. Таму прапануём вам правесці гэта свята ў кампаніі з героямі гумарэскі Васіля Ткачова. Мы ўпэўнены, што 2018 год пасля гэтага будзе напоўнены шчырымі ўсмешкамі і пазітывам.*

*Жадаем юбіляру здароўя, добрага самаадчування, новых творчых планаў, каб муза заўсёды была побач, а творы здзіўлялі чытачоў сваёй задумкай.*

**Васіль ТКАЧОЎ**

## Ганарар

*Гумарэска*

Празаік Сцёпкін атрымаў ганарар за раман, які надрукавалі ў даволі знакамітым часопісе. Пісьменнік прынёс запоўнены грашыма дыпламат дадому, стомлена плюхнуўся ў крэсла, выцер насоўкай лоб.

– Фу-у, ледзь датупаў, – уздыхнуў ён і ўказаў на ношу, – Кацюша, падымі, тут жа кілаграмаў пятнаццаць, не менш. У касе, праўда, не лічыў, бо да раніцы не паспеў бы з маімі матэматычнымі здольнасцямі.

Жонка была на сёмым небе ад шчасця. Калі ўбачыла грошы, у яе спярша адняло мову, а потым жанчына пачала ўсміхацца. Калі яна бачыла такую суму? Мо толькі ў кіно. Ці ў Якубовіча на «Полі цудаў». А гэта ж свае! Бяры, размяркоўвай, якія дзіркі ў сямейным бюджэце зацыраваць.

– Яначка, мой родненькі, які ж малайчына! – жонка пацалавала мужа. – Хай табе здароўечка Бог дае. Можаш нават выпіць сёння сто грамаў.

Сцёпкін задаволена затрос галавой. Жонка перакуліла дыпламат, грошы рассыпаліся па часопісным століку. Яна яшчэ пэўны час, нібы зачараваная, дзівілася на іх, а потым падхапіла мужа пад руку:

– Хутчэй абедаць! Ты сёння зарабіў!

Не паспелі Сцёпкіны сесці за стол, як пазваніў сын, перадаў прывітанне ад жонкі і ўнука, а потым, нібы між іншым, пацікавіўся:

– Тата ганарар атрымаў?

Пакольկі ў гэтую хвіліну пісьменнік наліваў у чарку свае законныя сто грамаў, а маці размаўляла па тэлефоне, то яна крадком зірнула на мужа, паўшэптам сказала:

– Атрымаў...

Хутка ўспомніла пра бацькоў дачка. Патэлефанавала, маўляў, жывая, здаровая, у сям'і ўсё добра. Пра ганарар таксама пацікавілася. Паабяцала прыехаць, адведаць старых.

Шумна зрабілася неўзабаве ў кватэры Сцёпкіных, прыехалі родныя: дачка, сын, зяць, нявестка і ўнукі заявіліся амаль адначасова, быццам згаварыліся. Былі нават пацалункі, якіх раней бацькі не бачылі. Потым усе ўладкаваліся за сталом. Пад гэтую гамонку пісьменнік прапусціў чарачку. Жонка нават праслязілася: «Бедненькія мае, замораныя, працуеце за капейкі». Сцёпкін маўчаў. Ён прапусціў яшчэ сто грамаў, узняўся з месца і папрасіў увагі:

– Грошай я вам падкіну. Але! Спярша скажыце, як называецца мой раман, за які я атрымаў ганарар?

Усталявалася хвіліна маўчання.

– Ну? – патрабавальна запытаў пісьменнік.

– Тата, якая розніца, як называецца? – прытулілася да пляча дачка, пяшчотна пагладзіла апошнія кудзеркі на ягонай галаве. – Галоўнае, ты талент! Мы ўсе ганарымся табой!

Дарослыя запляскалі ў ладкі.

– Дзякуй! – узняў руку Сцёпкін. – Прыемна пачуць такія словы. Але хто чытаў гэты раман? – ён нетаропка агледзеў кожнага, хто сядзеў за сталом, і пашкадаваў, што вытыркнуўся з такім недарэчным пытаннем: калі нават назвы ніхто не ведае, то дзе ж там пра змест цікавіцца. – Эх, ганарарныя вы дзеці...

Ён вылез з-за стала, узяў на століку часопісы з надрукаваным раманам, паторкаў іх у рукі сыну, нявестцы, дачцэ, зяцю.

Адзін часопіс застаўся. Сцёпкін зірнуў на жонку, але, уздыхнуўшы, безнадзейна махнуў рукой і шпурнуў яго на канапу.

– Яны прачытаюць, Яначка, прачытаюць, – зашчабятала жонка. – Табе, можа, яшчэ чарачку?

– Гэта справа пачакае, – памяркоўна глянуў на жонку Сцёпкін, а потым скіраваў вочы ў бок дзяцей. – А вам, шаноўныя, вось што скажу: калі прачытаеце раман – прыходзьце, зраблю вам падарункі. Але трэба паспець за тыдзень, бо потым я паеду ў Дом адпачынку.

...Праз тры дні дзеці з сорамам у вачах расказвалі Сцёпкіну змест яго новага рамана.

*г. Гомель.*